Уласны погляд

Гучнае усім вядомае слова ***Адраджэнне***... Усе ведаюць гэта, усведамляюць значэнне гэтага перыяду. З гэтым нас упершыню з самага дзяцінства знаёмяць у школе. Потым сэнс і мэты гэтага гістарычнага перыяду мы падрабязна вывучаем у ВНУ. Карацей, усім вядома такая з'ява, як Еўрапейскае Адраджэнне, але ж гэта можна сказаць, не датычыцца нашай краіны.

А што ж уласна з нашай роднай гісторыяй? Тут справа зусім іншая... Быў некалі і на нашай зямлі прамежак часу, які таксама завуць Адраджэннем, толькі вось не антычным, а сваім, нацыянальным. Было вяртанне на узор сярэдневечча сваёй гістарычна-культурнай спадчыны і мовы. Ды толькі вось, нажаль, гэты перыяд зусім не сусветнай, а цалкам уласнай гісторыі кепска вядомы не толькі беларускай цяперашняй моладзі, але і людзям сталым, якім пра гэта мелі магчымасць расказаць не падручнікі, а самі сведкі тых падзей. Ды толькі зноў іншая атрымліваецца рэч. Беларускае Адраджэнне пачатку XX ст. на самай справе было, але ж хто ў той час ведаў і усведамляў гэта? Хто мог потым пра гэтую з'яву грамадскай актыўнасці расказаць сваім дзецям? Тым самым дадаць гонару сваім нашчадкам за ўласных бацькоў... Амаль адзінкі...

Вось і атрымліваецца, што памяць народа не захавала гэтага, бо па-праўдзе на перыяд развіцця такой з'явы не ўспрымала такое наша грамадства, а дакладней мала што ведала пра гэта і такім чынам не ўкараніла ў свядомасць сваіх дзяцей і пазбавіла іх гонару за ўласную зямлю... А цяпер нам, нашчадкам выпадае прагал ва ўласнай гісторыі, а значыцца і ва ўласнай культуры, а самасвядомасць ўвогуле згубіла маральную вартасць характэрную нашаму народу!.. Бо ж усім вядомы савецкі перыяд. Бальшавіцка-галадранцкая ідэалогія, якая нажаль і зараз амаль у нас пануе... Якая сістэматычна амаль вынішчыла ушчэнт тыя парасткі, якія далі актывісты-першапраходцы нашай уласнай гісторыі і культуры, а самае галоўнае - Мове! Мова, яна ўвесь час была першасным пытаннем пры пабудове нашай незалежнай дзяржавы, увесь час стрымлівала на сабе ўдары хцівых суседзяў, якія не жадалі побач бачыць нашую вольную краіну.

Добра. Гэта ўсё з нашай гісторыі. А што ж атрымліваецца, калі ўзяць наш час, нашу свядомасць і ўсведамленне такой справы, як патрыятызм, але патрыятызм не навешаны, не падмаляваны і не найграны, а што ні на ёсць сапраўдны? Зусім іншая малюецца жыццёвым мастаком карціна...

Такія былі на пачатку думкі...

Але прайшоў некаторы час, змяніліся дні каляндара, змянілася думка. Думка... думка мая, уласная... Па выказванні сваячкі з Мурманска, на яе ўласную думку, я зараз артадаксальны беларус, беларус, які імкнецца і захоўвае ў душы незразумелыя для шматлікай большасці насельніцтва пачуцці, думкі, меркаванні...

Зараз лістапад... Макрэча, халадэча - людзі адчуваюць надыход добрых халадоў, чакаюць спаду эканамічнага крызісу, добрых зарплат і таннаых коштаў ў крамах. Усе мы разумеем - гэта жыццё паўсядзённае, усе хочуць жыць ў дабрабыце, нешта каштоўнае мець, гэтым карыстацца, выхваляцца гэтым перад іншымі, карацей - каб было добра і нібыта - як у пасляваенныя гады - каб не было вайны...

Я таксама амаль звычайны чалавек, думаю пра заўтрашні дзень, атрымліваю асалоду ад бягучага... Побач заўсёды добрая, ласкавая і пяшчотная дзяўчына, дзяўчына-мэта... Але мая мэта не толькі ў ¨й, але і ў іншым не цялесным, ды і думка жыцця майго жадае лепшага. Духоўнасць - спрадвечнае змаганне, мэта сусветных гуманітарыяў. Духоўнасць як частка жыцця чалавека, частка ягоных мэтаў і памкненняў, памкненняў асобы, супольнасці, плыні і дзяржавы... Адукаваныя людзі разумеюць, што без духоўнасці немагчыма існаванне ніводнага вышэй пералічанага. У супольнасці - мэта, у плыні -думка, у дзяржавы цэлы стос доўгага пераліку кампанентаў. Ды толькі ўсе мы разумеем, што ўсё гэта складаецца нібыта з малекул-асоб. Асоба - гэта на маю думку рэч недатыкальная. Так, менавіта рэч, менавіта недатыкальная, бо ў гэта паняцце "асоба" кожны ўкладвае сваё, успрымае гэта зыходзячы з менталітэту, выхавання, узроўню адукацыі і ў пэўнай ступені праз гены... Бо можна жыць узровень з сучаснасцю, весці знешне паўсядзённае жыццё, ды быць амаральным чалавекам у класічным разуменні выразу *Чалавек разумны*. Зараз узнікае пытанне, да чаго ж гэта ўсё... Гены, адукацыя... Вы вось уявіце сабе чалавека-шляхціца (беларуса) прыкладна пачатку XIX ст.. ¨н відаць адрокся ад свайго, прыняў ласку імператара і жыве цяпер больш-менш у спакоі, але без сумлення ў душы!.. Зноў амаль лухта ў тэксце?.. Ды толькі ён здрадзіў сваёй радзіме (наўмысна з малой літары) маючы пэўную адукацыю, добрае выхаванне і менталітэт продкаў, а абгрунтаваў гэта сваім паняццем - час. Бо ён мяркуе, што надышлі іншыя часы і патрэбна жыць весела гледзячы ў будучыню, кро-чыць, прыстасоўвацца да но-вых умоў жыцця, парадкаў і законаў... А папярэдняе жыццё можна толькі ўспамінаць у сонных думках і з падачы новых гаспадароў, жыць і не думаць самому, спадзявацца на прыдбанага усходняга гаспадара. А калі атрымаецца так што гаспадар адрачэцца ад яго, то можна лёгка перайсці ў "саюзнікі" і падпарадкаванне да заходняга "пабраціма "...

Гэта ўсё быў выдуманы выпадак. Шляхціц ёсць асоба, але якая, у якім разуменні? Так, яго можна зразумець. Усе зноў жа хочуць жыць, але да якой плыні можна яго аднесці, як можна вызначыць узровень яго адукацыі? Якім ён сам можа апісаць свой менталітэт і адказаць на тое, куды і як зніклі яго гены? Адказ просты - гэта ўсё прысутнічае, але ў яго сучаснасці знікла з-за непатрэбшчыны. У выніку ўсяго гэтага стала немагчымым вызначэнне яго-чалавека як асобы.

Маё прозвішча - Галкоўскі. Гучыць на польскі манер і амаль усе кажуць, што я з палякаў. Нібыта ў нас не было раней сваёй шляхты, якая захавала пэўны менталітэт, незалежнасць у душы, павагу да роднай мінуўшчыны і самае галоўнае прынесла гэта мне, аднаму са сваіх нашчадкаў.

Беларускі гісторык Алег Трусаў 30 кастрычніка 2009 года ў прыдбанай мною ягонай кнізе пажадаў заўжды трымацца роднай мовы, гісторыі і культуры. Так. Гэта праўда, такое пажаданне сапраўды неабходна для звычайнага сучаснага чалавека, грамадзяніна сваёй краіны, а самае галоўнае - для беларуса. Цікава, ды толькі годам раней, а менавіта 27 лістапада 2008 года, у прыдбаным мною дыску беларускага пісменнікабарда Эдуарда Акуліна было пажаданне: "Алесь Алесевіч, любі Беларусь як Янка Купала і Максім Багдановіч!" Тады я прыняў гэта на заўвагу і зараз удзячны гэтым здаецца простым словам. Таксама я вельмі ўдзячны Алегу Анатолевічу Трусаву за той давер, з якім ён пісаў мне пажаданне на будучыню нібыта як самасвядомаму беларусу. Але няхай ён прабачае, ды толькі гэта з яго боку, здаецца, памылка такое пісаць мне! Не! Не ўвогуле, а менавіта мне, бо не зведаць відаць болей анікому маіх пачуццяў і адносін да беларускага культурнага Адраджэння так, як ведае гэта мая цудоўная дзяў-чынка. Менавіта толькі і толькі яна бачыла мой той сумны выраз твару са слязьмі на вачах, нават пры праслухоўванні звычайных пранікнёных вершаваных радкоў альбо сумных песень, якія маюць дачыненне да Беларусі ці да нашай гісторыі, культуры і мовы... У такія моманты яна кажа, што я іншы, незвычайны чалавек. Так. Сапраўды. У душы я зараз закамянелы, артадаксальны і самасвядомы беларус, а такіх відаць адзінкі ў нашым грамадстве. Але ж такімі не нараджаюцца, імі становяцца. Становяцца пры падрымцы і дзякуючы генам продкаў, праз бацькоўскае выхаванне, свядома накіраваную ў гэтае рэчышча адукацыю. Такім чынам фармуецца ў дзяцей і моладзі менталітэт. Але ж я мяркую, што толькі менавіта ў такой сукупнасці і паслядоўнасці гэта адбываецца, а калі адзін з кампанентаў не ў тым кірунку альбо губляецца, то атрымаецца зусім іншая асоба... Узгаданы Алег Анатолевіч відаць думаць і не думаў, што яшчэ задоўга да пісаных ім пажаданняў прычыніўся ён на занятках да фармавання мае асобы, асобы артадаксальнай.

Вынік папярэдняга абзаца такі, што калі б не было тых існых каранёў маіх, менавіта беларускага шляхецтва, што так упарта адмаўляюць замежныя і нават некаторыя ўласнабеларускія гісторыкі, то не было б пэўна і маёй такой вось асобы, той ментальнасці адметнай маім продкам, а ў агульнай з'яве не існаваў бы і славуты беларускі менталітэт... Бо я частка той нацыі, якая не скарылася павевам часу, не стала прыстасаванцам, а проста жыла і несла гэтыя пачуцці і адносіны да свайго сваім нашчадкам і верыла, што нарэшце будзе, будзе чарговае беларускае Адраджэнне. Самае ж галоўнае ў наш час тое, што мы маем магчымасць гэта пранесці ў будучыню і не забыць папярэдніх змагароў, выказаць падзяку ім праз ушанаванне: назвы вуліц, раёнаў, устаноў, мастацкія творы і нават прадуктаў вытворчасці. Павінны не зрабіць так, як зрабіў узгаданы шляхціц-беларус XIX ст..

Мы ж жывём ў XXI-м... Навошта ж зноў імкнуцца да крыху лепшага, але чужога... Усходняе партнёрства... Еўрасаюз... Нейкія міфічныя дапамогі і падтрымкі-крэдыты -усё гэта добра, але што ж патрабуюць ад нас пры вяртанні? Усход мову забраў, а захаду што потым? Тэрыторыю? Дык не прасцей захаваць хоць тое, што засталося і балансаваць паміж імі, суседзямі?! Бо такі наш лёс... Ніхто не думаў аб гэтым, а проста ішоў услед чужой думцы, думцы заходняй, усходняй, ды толькі не думаў, што можна мець цалкам сваё, уласнае і быць сапраўды незалежнымі і суверэннымі, а не тытульнай нацыяй...

Магчыма тады і пачнецца сапраўднае Беларускае Адраджэнне, пра якое так гучна зараз кажуць. Толькі адраджэнне сваімі сродкамі, дзеля сваіх нашчадкаў, бо зараз інакш чым уласна нам гэта анікому не патрэбна! І змогуць захавацца тады ў памяці народа тыя імёны, якія стануць першапраходцамі ў гэтай з'яве, і самі працэсы Адраджэння будуць зразумелымі ўсім без выключэння нават праз стагоддзі. Але ж гэта трэба усвядоміць, адмовіцца ад чужацкіх думак і проста распачаць дзеля беларускай будучыні, дзеля нашчадкаў, дзеля Беларусі!..

Алесь Галкоўскі,
студэнт БДУКМ.

Павел Сцяцко

Мовазнаўчы досвед

Уседарожнік - усюдыход. "Што ні кажы, а *ўседарожнік* - машына адметная!" *(Полымя. 2009. №8. С.132).*

Слоўнікі фіксуюць толькі кальку з расейскай мовы - *усюдыход (вездеход)* з семантыкай 'аўтамашына на гусенічным хаду, прызначаная для язды ў цяжкіх дарожных умовах' *(Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. 1996, с. 700).*

Уласнамоўнае слова ***ўседарожнік*** - досыць матываванае абазначэнне рэаліі (паняцця) - 'машына, здатная праходзіць (праязджаць) усе дарогі'. І структура яго выразная: складана-суфіксавае ўтварэнне: *усе + дарог(і) + -нік —> уседарожнік.*

Тупак — тупіца. "Ды і хто з *тупакоў* калі любіў разумных? Але жыццё дае кожнаму тое, чаго ён варты". *(Маладосць. 2009. №8. С.22).*

Слоўнікі фіксуюць толькі ***тупіца*** (супольнае з расейскім *тупица*). Між тым асабовыя адпрыметнікавыя назоўнікі з суфіксам *-ак (-як)* складаюць прадукцыйны тып: *дабрак, бядняк, прастак* (і *прасцяк*), *сляпак, халасцяк, чужак*... Форма *тупіца* хутчэй стасуецца з прадметам, найменнем яго: *тупая сякера (піла) — тупіца.*

Сотавік, мабільнік. "Ішла тут у гэты час нейкая бабуля з унучкаю. Перапалохаліся. Унучка адразу пазваніла па *сотавіку* ў міліцыю, потым у "хуткую дапамогу". *(Полымя. 2009. №8. С.132).* ***Сотавік*** - утварэнне (шляхам кандэнсацыі, сцяжэння) ад намінацыйнага словазлучэння *сотавы тэлефон*: *сотав(ы)-ік. Сотавы тэлефон* - "аўтаномны тэлефон, звязаны радыёхвалямі з базавай станцыяй сувязі" *(Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мрвы. 1996, с. 163).*

Замест намінацыйнага словазлучэння ***мабільны тэлефон*** выкарыстоўваеіша аднаслоўнае найменне ***мабільнік***. *"Тэлефануй, як што спатрэбіцца... Дарэмна Ігараў мабільнік не ўзяў" (Дзеяслоў. 2009. №1. С.47).*

Жадунак - жаданне. "І як ёй, маладой, поўнай жадунку, абараніцца ад яго". *(Кастусь Цвірка. Воўчая выспа// Полымя. 2009. № 3. С.27).*

Тлумачальны слоўнік фіксуе толькі множналікавую форму *жадункі* як размоўную, якая мае значэнне 'дзіўныя жаданні, капрызы' *(Тлумачальны слоўнік беларускай мовы, т.2, с.247).* Да таго ж, без усякай тэкставай ілюстрацыі.

Лексема *жадунак* у знакамітага аўтара Кастуся Цвіркі мае тое значэнне, што і слоўнікавае *жаданне* - 'унутранае імкненне, цяга да ажыццяўлення чаго-небудзь; хаценне чаго-небудзь; ахвота'. Утворана на ўзор слоў *пацалунак, мацунак, кірунак.* Слова вельмі выразнае, сакавітае, заслугоўвае замацавання ў нарматыўным слоўніку беларускай мовы.

Запарыць - заварыць *(каву)***.** *"Зараз заварым гарбаты... Даспела гарбата і ўсе трое, пасеўшы на ложках, былі гатовыя да працягу размовы". (Дзеяслоў. 2009. № 1 (36). С.25). "Ну хоць бы запарым кавы, агледзімся і пойдзем на аўтобус" (Тамсама, с. 29).*

Тлумачальны слоўнік падае дзеяслоў *запарыць* якраз з тым значэннем, што і ў згаданых тэкстах - 'прыгатаваць настой, заліўшы варам'. *Запарыць ліпавы цвет (ТСБМ, т.2, с. 361).*

З аналагічным значэннем фіксуецца і слова *заварыць* 'прыгатаваць навар, настой з чаго-небудзь. *Заварыць ліпавага цвету (Тамсама, с.286).*

Перакладныя слоўнікі падаюць толькі другое слова: *"Заварить сов. - заварыць; заварить чай - заварыць чай" (Русско-белорускнй словарь, 1993, т.1,с.441).*

Але калі прыгледзецца да гэтых слоў, то больш прыдатным ёсць слова *запарыць* (чай,! каву), а не *заварыць*, бо ніхто такі настой не варыць, а гатуецца ён шляхам запаркі, калі змесціва (каву, чай) заліваюць кіпнем, што запарвае яго.

Тушаніна — тушонка. "У нас цэлая рандэля кашы з тушанінай". *(Дзеяслоў. 2009. №1. С.23).*

Слова ***тушаніна*** ўтварылася ад дзеяслова *тушыць* 'варыць на малым агні ў закрытай пасудзіне' з выкарыстаннем суфікса *-анін-а (тушаніна)* і абазначае вынік названага дзеяння. Узорам для яго ўтварэння стала *квашаніна*, таксама назва стравы.

Найменне *тушаніна* вельмі выразнае паводле сваёй матывацыі • ('тушаная страва') і будовы і вартае занатавання ў літаратурным слоўніку. Акадэмічныя слоўнікі падаюць толькі *тушонка* - пазычанне з расейскай мовы *(тушёнка)*.

Беларускі цэнтр у Кіеве

Пытанне з адкрыццём беларускага цэнтра вырашылася за два месяцы. У часе візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Кіеў быў адкрыты Цэнтр беларускай мовы і культры на базе інстытута філалогіі Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта. Першапачаткова былі варыянты адкрыцця такога цэнтра ў Чарнігаве або Львове, але пасля перамоваў з старшынём ТБМ Алегам Трусавым пасол Украіны ў Беларусі Ігар Ліхавы зрабіў усё магчымае, каб цэнтр адкрыўся ў Кіеве.

Дырэктар інстытута філялогіі Кіеўскага нацыянальнага ўнівэрсітэта імя Тараса Шаўчэнкі, доктар філалагічных навук, загадчык кафедры сучаснай украінскай літаратуры Рыгор Семянюк расказаў пра задачы новага цэнтра.

- У нашым інстытуце вывучаецца больш, як 30 моваў, і існуе ўжо 15 моўна-культурных цэнтраў розных народаў свету. Гэта будзе 16-ты цэнтр, але першы ва Ўкраіне цэнтр беларусістыкі. Мэта яго – працяг і развіццё тых традыцый, якія стагоддзямі складаліся ў духоўным, культурным, літаратурным плане паміж нашымі народамі. А таксама развіццё новых традыцый, з якімі нашы дзяржавы крочаць, як незалежныя, у 21-м стагоддзі.